
СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

Сінтаксічныя адзінкі – словазлучэнне, сказ, тэкст

Разбор словазлучэння

Галоўнае слова + залежнае слова: ×┌што? ┐ ***пішу пісьмо*** -- **1) дзеяслоўнае;**
(дз.) (н.) **2) дзеянне і яго прадмет;**
3) аб'ектнае;
┌ які? ┐ × **4) кіраванне.**
Высокі падмурак -- **1) назоўнікавае;**
(прым.) (н.) **2) прадмет і яго прымета;**
3) азначальнае;
4) дапасаванне.



Галоўныя члены сказа

Дзейнік **(**хто? што?**):** *Ракоча* (што?) ***прыбой*** *і не ведае зморы.*
Усе (хто?) ***рабочыя*** *ўсталі з месца.*

Выказнік **(**што робіць прадмет?**):** *Ввечарам мы* (што зрабілі?) ***сабраліся*** *ў школьным будынку.*
(які прадмет?**):** *Беларусь мая* (якая?) ***сінявокая***.
(што ён такое?**):** *Мінск* –(што ён такое?) ***сталіца*** *Беларусі.*

Даданыя члены сказа

Дапаўненне	**Азначэнне**	**Акалічнасць**
Н. –	**(**які? чый?)	дзе? куды? адкуль?
Р. (каго**?** чаго?**)**	(якога? чыйго?)	як? калі? наколькі?
Д. (каму? чаму?)	(якому? чыйму?)	чаму? навошта?
В. (каго? што?)	(якога? чыйго?)	па якой прычыне?
Т. (кім? чым?)	(якім? чыім?)	з якой мэтай?
М. (аб кім? аб чым?)	(аб якім? аб чыім?)	нягледзячы на што?

Узор сінтаксічнага разбору простага сказа (5 кл.)

Цёплая летняя ноч павольна апускалася на зямлю і ўсё гусцей церушыла над ёю.

1. Апавядальны.
2. Няклічны.
3. Граматычная аснова:
ноч – дзейнік, выражаны назоўнікам;
апускалася, церушыла – аднародныя выказнікі, выражаныя дзеясловамі.
4. Развіты:
цёплая, летняя – азначэнні, выражаныя прыметнікамі;
павольна – акалічнасць, выражаная прыслоўем;
на зямлю – акалічнасць, выражаная назоўнікам з прыназоўнікам;
гусцей – акалічнасць, выражаная прыслоўем;
над ёю – дапаўненне, выражанае займеннікам з прыназоўнікам.
5. Ускладнены аднароднымі выказнікамі.

Узор сінтаксічнага разбору простага сказа (9 кл.)

За два гады наступлення мы ўсе, спакутаваныя ў крывавых баях, пэўна, адспавядаліся адзін перад другім душой.

1. Апавядальны.
2. Няклічны.
3. Двухсастаўны.
4. Поўны.
5. Граматычная аснова:
мы – дзейнік, выражаны назоўнікам;
адспавядаліся – просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам.
6. Развіты:
за два гады – акалічнасць часу, выражаная колькасна-іменным словазлучэннем;
наступлення – ускоснае дапаўненне, выражанае назоўнікам;
усе – дапасаванае азначэнне, выражанае займеннікам;
спакутаваныя ў крывавых баях – дапасаванае адасобленае азначэнне, выражанае дзеепрыметным зваротам;
адзін перад другім – акалічнасць спосабу дзеяння, выражаная непадзельным словазлучэннем;
душой – ускоснае дапаўненне, выражанае назоўнікам.
7. Ускладнены адасобленым азначэннем, пабочнай канструкцыяй.